Р. Р. ЛАЗЬКО

# «ЯГЕЛОНСКАЯ ІДЭЯ» Ў ПАЛІТЫЦЫ ПОЛЬСКАЙ РЭСПУБЛІКІ Ў МІЖВАЕННЫЯ ГАДЫ

У другое міжваеннае дзесяцігоддзе Польская Рэспубліка ўступіла ў абстаноўцы цяжкага эканамічнага і сацыяльнага крызісу, росту палітычнай напружанасці. Але былі і светлыя бакі ў яе становішчы: у 1932 г. пасля працяглых перамоў удалося падпісаць дагавор аб ненападзенні з Савецкім Саюзам, у студзені 1934 г. — дэкларацыю аб непрымяненні сілы з Германіяй. У час паміж гэтымі датамі рэзка пагоршыліся савецка-германскія адносіны, аслабляючы тыя палітычныя ціскі, якімі было для Польшчы цеснае супрацоўніцтва двух яе суседзяў. Шырока прапагандуючы знешнепалітычныя поспехі, санацыйны рэжым імкнуўся выкарыстаць іх для ўмацавання сваіх пазіцый у краіне і актывізацыі ролі Польшчы ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне. У сакавіку 1934 г. на нарадзе блізкіх сваіх супрацоўнікаў Ю. Пілсудскі падкрэсліваў, што іменна на ўсходзе Польшча можа стаць «уплывовым фактарам» [1].

У новых умовах ізноў узрасла актуальнасць «ягелонскай ідэі» аб асаблівай ролі Польшчы ва Усходняй Еўропе як бастыёна заходняй цывілізацыі і апякункі суседніх невялікіх дзяржаў. Усё цясней у гэтыя гады «ягелонская ідэя» звязваецца з так званай «праметэеўскай акцыяй». Гэта было нібы «другое дно», амаль нябачная плынь польскай усходняй палітыкі, заснаванай на ўпэўненасці колаў, блізкіх да Ю. Пілсудскага, у хуткім развале СССР. Акцыя, што атрымала такую рамантычную назву, нарадзілася ў 1920 г., яшчэ да заканчэння польска-савецкай вайны, калі па ініцыятыве Т. Галуўкі стаў выдавацца штотыднёвік «Пшымежэ» («Саюз»). На пачатку 1926 г. пры ўдзеле Пілсудскага і Галуўкі была створана арганізацыя «Праметэй», у якую ўвайшлі прадстаўнікі розных нацыянальных груп эміграцыі з Расіі (акрамя беларусаў) [2]. Галоўнымі крыніцамі яе фінансавання былі Міністэрства замежных спраў (МЗС) і аддзел разведкі генштаба. Ганаровымі членамі варшаўскага клуба «Праметэй» сталі вядучыя санацыйныя палітыкі Я. Енджэвіч, А. Коц, вядомы публіцыст В. Стпічыньскі, пісьменнік, адзін з творцаў легенды Пілсудскага Ю. Кадэн-Бандроўскі. Мэта арганізацыі ў разуменні органа польскай разведкі заключалася «ў аслабленні і раздрабненні Расіі» шляхам выдзялення са складу СССР нацыянальных дзяржаў [3]. Прапаганда «ягелонскай ідэі» аб вядучай ролі Польшчы на ўсходзе Еўропы павінна была ствараць маральна-палітычную легітымацыю «праметэеўскай акцыі».

Значэнне, якое надавалася праметэізму ў кіруючых інстанцыях Польскай Рэспублікі, на працягу 20-годдзя неаднаразова мянялася. Яно залежыла як ад унутранага і міжнароднага становішча СССР, так і ад характару польска-савецкіх адносін. Ініцыятары стварэння «праметэеўскіх» арганізацый спадзяваліся на магчымасць іх выступлення «у выпадку перавароту ў Маскве» [4].

Польска-савецкі дагавор аб ненападзенні 1932 г. унёс пэўную прахалоду ў адносіны да «праметэеўскай акцыі» з боку МЗС, якое цяпер ужо імкнулася не выяўляць сваёй прыналежнасці да яе. Што датычыцца ідэолагаў ягелонскай палітыкі, то для іх польска-савецкі пакт быў не толькі выявай імкнення да міру, «але і асэнсаваннем таго, што барацьба з расійскім імперыялізмам, у якую ў недалёкім будучым мы вымушана ўступім, стане перш за ўсё барацьбой нашай новай культуры з савецкай цывілізацыяй» [5].

У другой палове 30-х гадоў інтарэс да палітыкі на ягелонскай аснове ўзрос як у прапагандысцкім, так і ў практычна-палітычным плане. Характэрнай у гэтых адносінах была дзейнасць Ул. Банчкоўскага, супрацоўніка Варшаўскага Усходняга інстытута, рэдактара шэрагу перыядычных выданняў. І Усходні інстытут, і гэтыя выданні фінансаваліся з сакрэтнага фонду разведаддзела генштаба. У публіцыстыцы Банчкоўскага цікавай з'яўляецца спроба разгарнуць «ягелонскую ідэю» у шырокую праграму. Ён лічыў, што польскі «імперскі нацыяналізм» павінен быць пазітыўным і ўсебакова творчым, павінен ствараць трывалы і справядлівы лад у балтыйска-чарнаморскім міжмор'і. «На ўсходзе прапануецца «праметэеўскі» план: вызваленне народаў, прыгнечаных Расіяй, і злучэнне іх такім чынам з Захадам, а значыць, і з Польшчай; на поўначы — барацьба за палітычную незалежнасць Прыбалтыкі, нейтралізацыя тут экспансіі Расіі і Германіі; на поўдні — так або іначай інтэрпрэтаваная ідэя імперыі цэнтра; у адносінах да Захаду — стварэнне... умоў для новага Грунвальда на выпадак агрэсіі Германіі» [6]. У публікацыях Ул. Банчкоўскага назіраецца хутка нарастаючая агрэсіўнасць у адносінах да СССР, за кошт інтарэсаў якога ў асноўным і павінна была ажыццяўляцца знешняя палітыка на «ягелонскай» аснове. Яшчэ восенню 1936 г. ён акцэнтуе незацікаўленасць Польшчы ў тэрытарыяльных набытках, а

Ужо праз паўгода падкрэслівае: «Мы робім стаўку на актывізм супраць пасіўнасці, на перамены, якія ўжо адбываюцца, супраць статус-кво, які церпіць паражэнне, на фашызм, гітлерызм, савецізм (так! — Р. Л.) як на сілы пераможныя...» Для яго яшчэ не ясна, з кім канкрэтна неабходна супрацоўнічаць у разбурэнні існуючага становішча, адно было вызначана — не з Расіяй, «ненажэрнай і агрэсіўнай імперыяй, якая 160-мільённым цяжарам» навісае над Польшчай [7].

Ідэі, якія раней выказваліся людзьмі, непасрэдна звязанымі з «праметэеўскай» палітыкай, падхопліваюцца цяпер іншымі органамі друку з лагера санацыі, як правага («Зачын»), так і ўмеранага напрамку («Наруд і паньство»). Агульным для іх быў лейтматыў аб місіянерскай ролі Польшчы ў адносінах да народаў Усходняй Еўропы, аб сувязі гэтай яе місіі з ранейшай палітыкай Пілсудскага. «Зачын» амаль даслоўна цытаваў «крэда» ўсходняй палітыкі маршала, у адпаведнасці з якім «Польшча павінна стаць на Усходзе не толькі найвялікшай ваеннай, але і культурнай сілай...» Узмацненне прапаганды вялікадзяржаўнасці на аснове «ягелонскай ідэі» не выпадкова прыйшлося на 1936—1937 гг. Яно было звязана з пачаткам арганізацыйнай і прапагандысцкай работы, якую разгарнула правае крыло санацыі дзеля стварэння ў краіне арганізацыі таталітарнага характару. Галоўнай мэтай яе дзейнасці аб'яўлялася «абарона Польшчы» у шырокім сэнсе, уключаючы эканоміку, унутраную палітыку і выхаванне. А ў сферы знешнепалітычнай прапаганды якраз «ягелонская ідэя», якая напаміналa аб гістарычнай славе палякаў, найлепшым чынам надавалася на тое, каб «стаць ідэалагічным паказальнікам шляху для «прагнуўшых вялікай ідэі» пакаленняў» [8].

Стымулявала актыўнасць санацыі ў ідэалагічнай сферы таксама яе барацьба з канкурэнтам на правым флангу — «нарадовай дэмакратыяй» (эндэцыяй), якая ў сярэдзіне 30-х гадоў пашырала свой уплыў на моладзь. Для эндэцыі, як і для санацыі, праграмнай была ідэя неабходнасці набыцця Польшчай статуса вялікай дзяржавы. Сродкамі яе рэалізацыі эндэкі традыцыйна лічылі як унутраныя пераўтварэнні, у тым ліку і асіміляцыю славянскіх меншасцей, так і актыўную, накіраваную супраць Германіі знешнюю палітыку з апорай на Францыю. Але ў сярэдзіне 30-х гадоў пачалі праяўляцца сімптомы змены гэтага курсу. Яшчэ на працягу 1932 г. орган інтэлектуалаў-нацыяналістаў «Мысль Народова» неаднаразова выступаў з крытыкай тых «партыкулярных патрыётаў» з каланіяльнай псіхалогіяй, якія марацъ аб Польшчы, што прасціралася б да Чорнага мора [9]. Але ўжо ў 1934 г. той жа орган аддае свае старонкі аўтару, які, спасылаючыся на выкананую Польшчай у мінулым цывілізатарскую місію, заклікае суайчыннікаў не забываць аб яе першынстве сярод дзяржаў славянскага свету, імкнуцца будаваць вялікую Польшчу на ўзор Ягелонскай. Толькі эпоха Ягелонаў, пісаў гэты аўтар, «навучыла нас бачыць далей і глыбей разумець свой інтарэс; для яе была ўласціва амбіцыя арганізацыі славянскага свету па-свойму і служэння ўжо не толькі Польшчы, але адначасова ўсяму свету» [10]. Што гэты сімптом не быў выпадковы, сведчаць тыя новыя ноткі, якія з'яўляліся раз-пораз у публікацыях па пытаннях знешняй палітыкі старэйшага і галоўнага органа эндэцыі — «Газеты Варшаўскай» (з 1935 г. — «Варшаўскі дзённік народовы»). Яны тым больш сімптаматычныя, што ў адрозненне ад «Мыслі народовэй», газета імкнулася прытрымлівацца ўмеранага напрамку. Застаючыся ў цэлым на антыгерманскіх пазіцыях, бачачы галоўны інтарэс Польшчы на Захадзе, гэты орган не выключаў магчымасці «вялікіх перспектыў» для Польшчы ў выніку цэнтрабежных тэндэнцый у СССР, «але ў далёкай будучыні» [11].

Такое новае стаўленне да «ягелонскай ідэі» з боку нарадоўцаў было звязана з тымі ідэйна-арганізацыйнымі працэсамі, якія ў сярэдзіне 30-х гадоў перажываў гэты палітычны лагер. У выніку нарастання ў ім нацыяналістычна-таталітарнай тэндэнцыі ў 1934 г. са складу Стронніцтва Народовэго (ОН — Нацыянальная партыя) выйшла дынамічная група маладых праварадыкальных дзеячоў, стварыўшых так званы «Нацыянальна-радыкальны лагер» (польская абрэвіятура — ОНР). Пад уздзеяннем рэпрэсій з боку ўлад ОНР у хуткім часе раскалоўся на дзве новыя арганізацыі, а частка яго кадраў вярнулася ў ОН, надаўшы партыі яшчэ больш радыкальны, нацыяналістычны характар. Оэнэраўцы як бы выхапілі з ідэйнага арсенала санацыі «ягелонскую ідэю» і надалі ёй адкрыта ваяўнічае гучанне. Але не забываліся пры гэтым і аб рахунках Польшчы з Германіяй. Б. Пясецкі, адзін з лідэраў ОНР, аб'яўляўаднабаковай і нездавальняючай як арыентацыю «фронтам на Захад», так і экспансію на Усход [12]. Ужо праграма ОНР 1934 г. ставіла мэту аб'яднання ў межах польскай дзяржавы не толькі тэрыторый з кампактна пражываючым польскім насельніцтвам, але і тэрыторый, якія «знаходзяцца пад уплывам польскай цывілізацыі». Сродкамі вырашэння гэтай задачы лічылася культурная экспансія, а пры неабходнасці і вайна. У пазнейшых публікацыях маладыя нарадоўцы яшчэ больш трапна акрэслівалі гэту задачу.

Гістарычнай місіяй Польшчы яны аб'яўляюць экспансію на ўсход дзеля стварэння вялікай каталіцкай дзяржавы [13]. Гаворачы аб сродках для рэалізацыі пастаўленай мэты, вядомыя дзеячы гэтай плыні О. Шпакоўскі, В. Квасеборскі праяўлялі сябе як эпігоны федэралісцкай канцэпцыі Пілсудскага і «праметэеўскай» ідэалогіі. О. Шпакоўскі, напрыклад, пісаў, што «без арганізацыйнай падрыхтоўкі з боку Польшчы ўнутранай рэвалюцыі ў Расіі перамога ў няроўнай барацьбе з'яўляецца нерэальнай» [14]. «Мысль народова», далучыўшыся да абмеркавання праблемы, лічыла найбольш верагодным спалучэнне дзвюх магчымасцей для дасягнення мэты: уздзеянне на Расію культуры Захаду, «рымска-каталіцкага духу», і яе распад на меншыя дзяржаўныя ўтварэнні. Відавочна, такое яўнае пераймание маладымі нарадоўцамі «праметэеўскай» ідэалогіі не ў апошнюю чаргу стымулявалася палітычнымі працэсамі ў СССР, якія ўспрымаліся як прызнак яго аслаблення.

Оэнэраўская «аранжыроўка» ягелонскай ідэі была пакладзена ў аснову знешнепалітычнага раздзелу праграмы «Руху маладых» нарадоўцаў 1937 г. У ёй прама гаварылася, што «гістарычнай місіяй Польшчы з'яўляецца стварэнне эпохі хрысціянскага нацыяналізму, заваяванне Усходу Еўропы для хрысціянскай цывілізацыі і арганізацыя славянскіх народаў». Аўтары праграмы не пакідалі ніякіх сумненняў ні адносна геаграфічных межаў гэтай цывілізацыі, ні адносна палітычнай формы яе існавання. «Паміж прасторамі былых заходне-рымскай і візантыйскай цывілізацый», гаварылася ў ёй, там, «дзе Хробры * закладваў трэцюю імперыю, пануючы ў Празе, на Дунаі і ў Кіеве..., ёсць месца для трэцяй цывілізацыі, польскай, хрысціянскай, якая ідзе на заваяванне Усходу» [15].

Збліжэнне ідэйных пазіцый правага крыла санацыі і радыкалаў з нацыяналістычнага лагера, дынамізм маладых нарадоўцаў, якім яны выгадна адрозніваліся ад санацыйных арганізацый, падштурхнулі лідэраў санацыі да пошуку супрацоўніцтва з імі. Ужо ў 1934 г. міністр унутраных спраў Б. Перацкі, нацыяналіст па духу, правёў серыю неафіцыйных размоў з вядучымі дзеячамі маладых нарадоўцаў Г. Росманам і Я. Моздарфам. Абмяркоўвалася магчымасць стварэння адзінай маладзёжнай арганізацыі на падставе ідэі заснавання блока дзяржаў паміж трыма морамі пры вядучай ролі Польшчы. Працягу перамоў перашкодзіла забойства Перацкага летам 1934 г. Але ў перыяд стварэння таталітарнага Лагера нацыянальнага аб'яднання (ОЗОН) яны былі адноўлены і ў выніку іх у чэрвені 1937 г. узнік санацыйна-нацыяналістычны «Саюз маладой Польшчы» пад намінальным кіраўніцтвам шэфа ОЗОН А. Коца і фактычным — аднаго з лідэраў ОНР Е. Руткоўскага. Ужо ў першым нумары органа Саюза «Маладая Польшча» фармуляваўся галоўны знешнепалітычны пастулат новай арганізацыі, адпаведна якому «вялікай і здаровай з'яўляецца толькі нацыя, якая валодае захопніцкай псіхікай, не абмяжоўваецца абаронай існуючага статус-кво, а імкнецца да бесперапыннага прымнажэння сваіх багаццяў і навязвання сваёй цывілізацыйнай ідэалогіі ўсім народам, з якімі яна сутыкаецца на сваім гістарычным шляху» [16].

Нарастанне ў дакументах ОНР агрэсіўнай нацыяналістычна-асімілятарскай тэндэнцыі рабіла для санацыі не вельмі зручным супрацоўніцтва з ёю, асабліва з улікам інтарэсаў знешняй палітыкі. МЗС ў гэты час (да канца 1938 г.) лічыла больш перспектыўнай канцэпцыю блока дзяржаў паміж морамі і рыхтавала адпаведную падставу для яго. Каб некалькі збавіць тон агрэсіўнай прапаганды оэнэраўцаў, у палеміку з імі ўступіла неакансерватыўная група публіцыстаў, якая карысталася падтрымкай МЗС і генштаба. Вядучы яе публіцыст А. Бохеньскі папярэджваў супраць выкарыстання «ягелонскай ідэі» для абгрунтавання знешнепалітычнай экспансіі, бо народы Усходняй Еўропы бачаць у ёй сродак іх асіміляцыі палякамі. «Ніводная мудрая ідэя, — пісаў ён у 1937 г., — нават калі б яе распрацоўвалі дзесятак Пясецкіх і Васютыньскіх (ідэолагі ОНР — Р. Л.), не здолее сёння апалячыць тыя народы, якія ўжо аднойчы амаль што былі апалячаны і цяпер захоўваюць пільнасць» [17]. Замест гэтага ён прапаноўваў накіраваць намаганні на стварэнне федэрацыі краін, «якія ляжаць паміж германскім рэйхам і расійскай этнічнай тэрыторыяй» [18] (падкрэслена мною — Р. Л.). У такой форме А. Бохеньскі як бы аб'ядноўваў праметэеўскую ідэю і федэратыўную канцэпцыю Пілсудскага, называючы палітыку, якая б магла будавацца на гэтай платформе, «рэлятывісцкай», г. зн. палітыкай адноснага ўзмацнення Польшчы за кошт аслаблення Расіі. Неакансерватары палічылі неабходным звязаць сваю

* Князь і кароль Польшчы Баляслаў Хробры (967—1025).

канцэпцыю, занадта рацыянальную, з ужо традыцыйнай ідэяй місіянерскай ролі Польшчы як носьбіта хрысціянскай культуры.

Тым часам змены ў міжнароднай сітуацыі зноў надалі актуальнасць «праметэеўскай акцыі». Цяпер яна пачала звязвацца з Антыкамінтэрнаўскім пактам і нават з магчымасцю вайны яго ўдзельнікаў супраць СССР. З улікам такой перспектывы ў генштабе ў канцы 1936 і ў першыя месяцы 1937 г. разглядалася магчымасць стварэння на тэрыторыі СССР украінскай дзяржавы, залежнай ад Польшчы [19]. У жніўні 1938 г. Ул. Банчкоўскі (напэўна, не па сваёй ініцыятыве) нанёс візіт у Берлін, дзе на працягу дзесяці дзён вёў перамовы з супрацоўнікамі ведамства А. Розенберга. Цікава, што ён адрэкамендаваўся там як прадстаўнік ваеннага міністэрства і міністэрства замежных спраў [20]. У сваёй справаздачы генштабу ён адзначыў карысную для Польшчы эвалюцыю антыкамінтэрнаўскай дзейнасці Германіі з антыкамуністычных, але «прадзянікінскіх» пазіцый на пазіцыі антырасійскія ў цэлым, якія характарызаваліся як «пазіцыі абароны еўрапейскай культуры». Дзейнасць Германії ў гэтым накірунку, на думку Ул. Банчкоўскага, «набліжае распад расійскага калоса, што павышае патэнцыял Польшчы ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе» [21].

Устанавіўшы кантакты з Германіяй, варшаўскія «праметэісты» тым не менш не збіраліся адмаўляцца ад самастойнай ролі Польшчы ў ажыццяўленні антысавецкай палітыкі. Наадварот, яны вельмі балюча перажывалі страты манаполіі ў гэтай сферы. Калі Японія праз пасольства ў Варшаве прапанавала свой удзел у фінансаванні «праметэеўскай акцыі», пытанне разглядалася на вышэйшым узроўні, з удзелам Э. Рыдз-Сміглы — пераемніка Пілсудскага на пасадзе генеральнага інспектара ўзброеных сіл. Грошы ў японцаў было вырашана не браць [22]. Аддзел разведкі генштаба прапаноўваў нарошчваць актыўнасць, палепшыць фінансаванне «праметэеўскіх» арганізацый, каб не выпусціць ініцыятыву з рук. Такі курс адпавядаў прынцыповай пазіцыі, выпрацаванай яшчэ Пілсудскім, у адпаведнасці з якой «рускую праблему» павінен быў рашаць не Захад, не Германія, а Польшча.

Разгул сталінскіх рэпрэсій у СССР паглыбляў перакананасць санацыйных палітыкаў у тым, што «руская праблема» выспявае. Такую думку настойліва праводзіў пасол Польшчы ў Маскве В. Гжыбоўскі, які абмяркоўваў яе ў МЗС ў снежні 1938 г. Як адзначыў у сваім дзённіку віцэ-міністр замежных спраў Я. Шэмбек, пасол «па расійскай праблеме стаіць на пазіцыі нашай граніцы 1772 года». І ў гэтай пазіцыі В. Гжыбоўскі быў не адзінокі. Шэмбек запісаў у сваім дзённіку пачутае ад дырэктара аднаго з дэпартаментаў МЗС Е. Патоцкага: «У сувязі з магчымасцю далейшага разлажэння Расіі **ў розных колах** у нас (падкрэслена мною — Р. Л.) абмяркоўваецца думка, ці нельга было б у сувязі з гэтым адсунуць нашы межы на ўсход, ахопліваючы раён Камянца Падольскага і Жытоміра» [23]. Такое магчымае перасоўванне цяпер звязвалася ўжо з адыходам ад ранейшай пазіцыі стварэння незалежнай Усходняй Украіны. «Ягелонская ідэя» пазбаўлялася свайго рамантычнага вобліку, застаючыся толькі адным са стымулаў у спаборніцтве з Германіяй за ажыццяўленне экспансіі на Усходзе. Яна канчаткова страчвае сваё значэнне аднаго з лозунгаў, пад якімі санацыя ажыццяўляла ўнутраную нацыянальную палітыку. Вынікам такой сітуацыі стала і адкрыццё ў пачатку 1939 г. рэдагуемага Ул. Банчкоўскім «Польска-украінскага бюлетэня».

Выступленне ў гэтай сітуацыі «рахітычнай» групы манархістаў з праектам, у якім беларусы, украінцы, літоўцы, як аўтахтоны ў польскай дзяржаве, аб'яўляліся яе гаспадарам нароўні з палякамі, выглядала палітычнай экзотыкай. Але ў публіцыстычных выступленнях аб сітуацыі ў Еўропе і знешняй палітыцы Польшчы водгукі «ягелонскай ідэі» сустракаюцца да самага лета 1939 г. — як у лагеры санацыі, так і сярод яе канкурэнтаў з правага флангу. Грозны міжнародна-палітычны кантэкст надаваў ім трагічны сэнс. Палемізуючы з прыхільнікамі гэтай ідэі, вядомы дзеяч эндэцыі прафесар Б. Вінярскі пісаў: «Добра гаварыць аб стварэнні ягелонскай сістэмы, калі не лічыцца з германскім супрацьдзеяннем», але «польская палітыка цяпер будзе ўсюды сустракацца» з ім [24].

Спробы ажыццяўлення ў міжваеннай Польскай Рэспубліцы ўнутранай і знешняй палітыкі на ягелонскай аснове адлюстроўвалі перш за ўсё імкненне дзяржавы і грамадскіх колаў знайсці спосаб існавання ў той складанай унутранай і геапалітычнай сітуацыі, у якой апынулася адроджаная краіна. Размешчаная гістарычным лёсам паміж Германіяй і СССР, спадкаемцамі тых дзяржаў, якія ў канцы XVIII ст. падзялілі Рэч Паспалітую, Польшча імкнулася стаць моцнай дзяржавай, здольнай супрацьстаяць сваім вялікім суседзям. Часткова гэту задачу вырашалі саюзы. Другі ж спосаб падказваўся гістарычнай традыцыяй, уваходжаннем у склад дзяржавы народаў, з якімі палякі былі звязаны агульным гістарычным лёсам і значная частка якіх знаходзілася па другі бок усходняй мяжы; нарэшце, бачнымі

ўнутранымі слабасцямі СССР, якія значна перабольшваліся. Гэта палітыка ажыццяўлялася ў дзвюх формах: у форме так званай «праметэеўскай акцыі» і ў спробах стварэння блока меншых дзяржаў ва Усходняй Еўропе пад палітычным патранатам Польшчы. Але ва умовах аўтарытарнага рэжыму, калі дзяржаўныя рашэнні прымаліся вузкім колам палітыкаў, прапаганда «ягелонскай ідэі» вяла да страты палітычных арыенціраў, адрыву ад рэчаіснасці.

[1] Гл.: C h a j n L. Zgromadzenie lokatorow // Polityka. 1967. 01.01. S. 11.
[2] Гл.: N o t k o w s k i A. Prasa w systemie propagandy rządowej w Polsce (1926—1939). Warszawa; Lodz, 1987. S. 376.
[3] Z dziejów stosunków polsko-radzieckich: Studia i materialy. Warszawa, 1968. S. 275, 287.
[4] Гл.: J a b l o ń s k i H. Zrozwazan o II Rreczypospolitej. Wroclaw etc., 1987. S. 448—449; M i k u l i c z S. Prometeizm w polityce II Rzeczypospolitej. Warszawa, 1971. S. 217—218.
[5] Pod znakiem odpowiedzialnosci i pracy. Warszawa, 1933. S. 228.
[6] B a c z k o w s k i W. Grunwald czy Pilawce? Warszawa, 1938. S. 19.
[7] Ibid. S. 39, 70.
[8] Jędruszczak T. Piłsudczycy bez Pilsudskiego. Warszawa, 1963. S. 87; C h o j n o w s k i A. Koncepcje polityki narodowosciowej rządaw polskich w latach 1921—1939. Wrocław, 1979. S. 190.
[9] Гл.: Myśl narodowa. 1932. № 37. S. 528; № 41. S. 590—591.
[10] Ibid. 1934. № 43. S. 622; № 47. S. 685—686; 1935. № 33. S. 505.
[11] Warszawski Dziennik Narodowy. 1935. 15.08; 1938. 20.03.
[12] Гл.: P i a s e c k i B. Duch czasów nowych a Ruch Młodych. Warszawa, 1935. S. 60—61.
[13] S z p a k o w s k i O. Polska przeciw marksizmowi. Warszawa, 1936. S. 18, 21; R u d n i c k i Sz. Oboz Narodowo-Radykalny: Geneza i dziatalnosc. Warszawa, 1985. S. 280—281.
[14] Ibid. S. 20—21.
[15] P i a s e c k i B. Przełom narodowy: Zasady programu narodowo-radykalnego. Warszawa, 1937. S. 15—16.
[16] M a j c h r o w s k i J. M. Silni, zwarci, gotowy. Warszawa, 1985. S. 171.
[17] B o c h e ń s k i A. Historia i politika. Wybór publicystyki. Warszawa, 1989. S. 68.
[18] Ibid. S. 151; B o c h e ń s k i A. Między Niemcami a Rosją. Warszawa, 1937. S. 49, 78—80, 181.
[19] Гл.: M i k u l i c z S. Op. cit. S. 127, przyp. 91.
[20] Гл.: B o r e j s z a J. Rzym a wspolnota saszystowska. Warszawa, 1981. S. 228.
[21] M i k u l i c z S. Op. cit. S. 278—279.
[22] Ibid. S. 267—268.
[23] Diariusz i teki Jana Szembeka. Lodz, 1972.T. IV. S. 381.
[24] Mysl narodowa. 1939. № 2. S. 26; № 6. S. 90.

Н. Е. АБЛОВА

# ПРОБЛЕМА КИТАЙСКО-ВОСТОЧНОЙ ЖЕЛЕЗНОЙ ДОРОГИ В МЕЖДУНАРОДНЫХ ОТНОШЕНИЯХ НА ДАЛЬНЕМ ВОСТОКЕ В КОНЦЕ ВТОРОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЫ

Китайско-Восточная железная дорога (КВЖД) имела важное экономическое, политическое и стратегическое значение в международных отношениях на Дальнем Востоке на протяжении всей первой половины XX в. Она являлась предметом пристального внимания развитых капиталистических стран (Англии, США), спорной проблемой в отношениях России (затем СССР) с Японией и Китаем. Во всех значительных международных соглашениях по Дальнему Востоку (с начала XX в. до 1953 г.) фигурировал вопрос о владении и управлении КВЖД, определении ее правового статуса.

Решение проблемы КВЖД в годы второй мировой войны находилось в прямой зависимости от процесса освобождения Северо-Восточного Китая (Маньчжурии) от японской оккупации. Еще в конце ноября 1943 г. представители Англии, США и Китая на конференции в Каире достигли соглашения о «будущих операциях англо-американских войск против Японии» и «возвращении Китаю всех отторгнутых территорий» [1]. На Тегеранской конференции руководителей трех союзных держав (28.11—01.12.1943) советское правительство дало принципиальное согласие принять участие в войне против Японии после разгрома Германии [2].

Вступление СССР в войну с Японией диктовалось государственными интересами страны. Прежде всего необходимо было обеспечить реальную безопасность дальневосточных границ после разгрома германского фашизма как в отношении угрозы со стороны Японии, так и в случае коренного изменения отношений между союзниками после окончания войны. Советское правительство учитывало важное военно-стратегическое положение Маньчжурии, где советской армии предстояло вести военные действия против Японии. Известный амери-